# Пра школьную сістэму: вельмі кароткая нататка

“Толькі вельмі нямногія добра ўяўляюць, чаму школы існуюць у сваім цяперашнім выглядзе… Гэта нейкі дзіўны прабел у грамадскіх ведах”, – так пачынае прафесар Бірмінгемскага ўніверсітэта **Гэры Томас** сваю знакамітую кнігу “Адукацыя: вельмі кароткае ўвядзенне” (1).


Прафесар Гэры Томас. Фота: birmingham.ac.uk

Падаецца, што неабходным крокам да адказу “чаму школы існуюць” з’яўляецца  ўдакладненне розніцы паміж адукацыяй як такой і абавязковай адукацыяй праз школьную сістэму. Добра вядома, што адукацыя – гэта працэс, а школы – сацыяльна створаная ўстанова. У той час як адукацыя “спрадвечная” – яшчэ **Сакрат**, **Платон** і **Арыстоцель** абмяркоўвалі і развівалі філасофію вакол найлепшых мэт і задач адукацыі, – школьныя сістэмы, якія мы маем сёння, былі створаны разам з фармаваннем нацыянальных дзяржаў. Патрэба ў абавязковай адукацыі (школьнай сістэме) у дзяржаве звязана з неабходнасцю сацыялізацыі грамадзян, стварэння агульнадзяржаўнай еднасці, заснаванай на лаяльнасці ўраду (2).

Адсюль вынікае, па-першае, што адукацыя як такая — гэта толькі адна з задач (а не адзіная задача) дзяржаўнай школьнай сістэмы. У гэтым кантэксце важна не ўпусціць розніцу паміж “мэтамі” і “задачамі” школьнай сістэмы.  Ёсць два звязаных, але розных пытанні:

- Навошта нам школа?
- Чаго мы спадзяемся дасягнуць у школе?

Адказ на першае пытанне — мэта, адказ на другое – задача. Мэты звязаныя з прычынамі, дзякуючы якім у нас існуе школа як інстытут, з тым, якую ролю яна адыгрывае ў жыцці людзей і грамадства ў цэлым. Гэта апраўданні, якія мы даем для існавання школьнай сістэмы. Задачы – гэта канкрэтны кірунак або вынікі, якіх мы спадзяемся дасягнуць у рамках мэты.

Многія тэарэтыкі пагаджаюцца з тым, што мэты збольшага аднолькавыя для ўсіх сістэм школьнай адукацыі ва ўсіх грамадствах (гл. вышэй). Задачы адрозніваюцца ў залежнасці ад тыпу палітычных і эканамічных сістэм. Напрыклад, ці есць задачай развіццё творчых, крытычных мысляроў, дэмакратаў і індывідуалістаў, ці – выхаванне вучняў, якія паважаюць уладу і добра дысцыплінаваныя?

Тут паўстае пытанне, якое тысячагоддзі таму назад задаваў Сакрат: ці можам мы казаць пра добрую адукацыю, не ведаючы, што такое справядлівае грамадства і дабрадзейны чалавек. З таго, што задачы залежаць ад таго, якім рысам вартай формы жыцця школьная адукацыя павінна спрыяць, вынікае: задачы школьнай сістэмы па сваёй сутнасці палітычныя (3).

Іншымі словамі, каб вызначыць агульнадзяржаўныя задачы адукацыі, трэба мець нейкае ўяўленне пра тое, як людзі ў грамадстве думаюць пра тое, што такое добрае жыццё, пра тое, якое грамадства яны жадаюць стварыць разам, і пра тое, з якімі асобамі яны спадзяюцца жыць. А

таксама выпрацаваць шляхі да таго, каб прыхільнікі розных жыццёвых вартасцей маглі дамовіцца аб гэтых агульных задачах.

**Васьміног**

Тэкст падрыхтаваны вядучай эксперткай “Васьмінога”, кандыдаткай гістарычных навук, эксперткай па пытаннях адукацыйнай палітыкі Офіса па адукацыі для новай Беларусі, сябрам Савета Беларускай Асацыяцыі адукацыі і навукі, кансультанткай праекта Belarus Beehive і праграмы “Беларуская адукацыя на шляху змяненняў” **Марынай Сакаловай**

### Крыніцы


```
1. Томас, Г. (2016) Образование. Очень краткое введение. С. 3

2. Андерсон, Б. (2001) Воображаемые сообщества https://tinyurl.com/29fezzwt

3. Peters, R. (1973). The Philosophy of Education. P.17
```


Падзяліцца

vasminoh.school 2023